ЗАЦВЕРДЖАНА
Дырэктар
Рэспубліканскага тэатра
беларускай драматургіі
__________ С.В.Навуменка
01.08.2024

# ПРАВІЛЫ НАВЕДВАННЯ ТЭАТРА

## 1. Агульныя палажэнні

1.1. Дадзеныя Правілы распрацаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры ад 20.07.2016г. № 413-З і іншымі нарматыўна-прававымі актамі.

1.2. Дадзеныя Правілы рэгулююць адносіны паміж гледачамі і дзяржаўнай установай "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь "Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі" (далей – тэатр).

1.3. Набываючы квіток на спектакль тэатра і прад'яўляючы яго на кантроль у тэатры, глядач выказвае сваю згоду з дадзенымі Правіламі і абавязваецца выконваць дадзеныя Правілы і грамадскі парадак у будынку тэатра.

## 2. Уваходны квіток

2.1. Уваход у будынак тэатра ажыццяўляецца толькі пры наяўнасці ўваходнага квітка на дадзенае мерапрыемства.

2.2. Уваходны квіток павінен мець абавязковыя рэквізіты, прадугледжаныя дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, і быць сапраўдным у адпаведнасці з пазначанымі ў ім датай і часам правядзення мерапрыемства.

2.3. Уваходны квіток з выпраўленнямі лічыцца несапраўдным.

2.4. Адміністрацыя тэатра не нясе адказнасці за сапраўднасць уваходных квіткоў, набытых не ў касе тэатра, не на афіцыйным сайце тэатра, не на сайтах квітковых аператараў (партнёраў тэатра) або не ва ўпаўнаважанай асобы тэатра.

2.5. У выпадку, калі будзе ўстаноўлена, што ўваходны квіток фальшывы або несапраўдны, глядач не дапускаецца ў глядзельную залу, вяртанне грошай або іншая кампенсацыя не адбываецца.

2.6. Пры набыцці квітка на спектакль тэатра неабходна ўлічваць узроставыя абмежаванні і іншыя папярэджанні пра асаблівасці спектакля, адзначаныя на сайце тэатра, а таксама даведвацца пра іх у касіраў білетнай касы Тэатра.

2.7. У выпадку выяўлення падвойных уваходных квіткоў на адно і тое ж месца неабходна звярнуцца да адміністратара, які вырашыць сітуацыю і прапануе заняць іншае свабоднае месца.

2.8. Дзеці наведваюць спектаклі ў суправаджэнні дарослых. Кожны глядач незалежна ад узросту павінен мець квіток на дадзенае мерапрыемства.

2.9. Квіткі, набытыя на сайце тэатра і на сайтах квітковых аператараў, прад'яўляюцца на ўваходзе ў раздрукаваным выглядзе.

## 3. Зварот, абмен, перапродаж і страта ўваходнага квітка

3.1. Зварот набытага ўваходнага квітка ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3.2. Набыты ўваходны квіток не падлягае абмену.

3.3. Перапродаж уваходнага квітка на мерапрыемства ў памяшканнях тэатра і на прылеглай тэрыторыі забаронены.

3.4. Тэатр не выдае дублікат і не пакрывае кошт згубленага ўваходнага квітка.

3.5. Уваходныя квіткі могуць быць вернуты па ініцыятыве грамадзяніна, юрыдычнай асобы не пазней чым за адзін каляндарны дзень да дня правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства ў месцах іх рэалізацыі (для электроннага квітка – з выкарыстаннем сетак электрасувязі, у тым ліку глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт), месцы правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства і (або) іншых месцах, вызначаных арганізатарам культурна-відовішчнага мерапрыемства. Пры гэтым грамадзяніну, юрыдычнай асобе, якія вярнулі ўваходны квіток, вяртаецца не менш за 75 працэнтаў кошту ўваходнага квітка (без уліку камісійнага збору электронных квітковых аператараў, камісійнага збору за браніраванне ўваходнага квітка і іншых выдаткаў, якія не ўваходзяць у кошт уваходнага квітка).

3.6. У выпадку вяртання ўваходных квіткоў па прычыне змянення аб'яўленых часу (тэрмінаў) і (або) месца правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства, замены яго іншым культурна-відовішчным мерапрыемствам, адмовы ад правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства грамадзянін,

юрыдычная асоба маюць права звярнуцца да арганізатара культурна-відовішчнага мерапрыемства з заявай аб вяртанні кошту ўваходнага квітка не пазней за дату правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства.

## 4. Абслугоўванне гледачоў з абмежаванымі магчымасцямі

4.1. Пры набыцці ўваходнага квітка для чалавека на інваліднай калясцы неабходна не менш чым за тры дні да наведвання мерапрыемства паведаміць пра гэта галоўнаму адміністратару тэатра або касіру (каса: +375 29 154 04 44).

## 5. Правілы паводзінаў у тэатры

5.1. Гледачы дапускаюцца ў будынак тэатра не раней чым за адну гадзіну да пачатку мерапрыемства.

5.2. Строгага дрэс-коду ў тэатры няма, дапушчальна дэмакратычная форма адзення. Тым не менш адзенне павінна мець ахайны выгляд і адпавядаць прынятым у грамадстве маральна-этычным нормам. Гледачы ў бруднай і (або) мятай вопратцы, спартыўных касцюмах, а таксама мужчыны ў шортах і (або) спартыўных майках, жанчыны ў дэталях купальніка ў глядзельную залу не дапускаюцца.

5.3. Гледачам можа быць адмоўлена ва ўваходзе ў будынак тэатра (або яны могуць быць выдаленыя з будынка тэатра) у выпадках, калі яны ствараюць перашкоды для правядзення спектакля, працы супрацоўнікаў тэатра, паводзяць сябе некарэктна, нецэнзурна выказваюцца, дапускаюць абразы ў бок работнікаў тэатра і г.д., турбуюць іншых гледачоў, выклікаюць сваімі паводзінамі непарадкі, раздражняюць людзей навокал, маюць неахайны выгляд або займаюць месца, на якое ў іх адсутнічаюць уваходныя квіткі.

5.4. Парадак наведвання спектакляў малалетнімі і непаўналетнімі вызначаецца арганізатарам мерапрыемства з улікам спецыфікі правядзення такога мерапрыемства.

5.5. Атрыманне аўтографаў і прыманне віншаванняў артыстамі тэатра ажыццяўляецца толькі пасля папярэдняга ўзгаднення з артыстамі і дзяжурным адміністратарам тэатра (адносна парадку і месца правядзення дадзеных працэдур).

5.6. Парадак уручэння артысту кветак і падарункаў загадзя агаворваецца з дзяжурным адміністратарам тэатра перад пачаткам мерапрыемства.

5.7. Уваход у глядзельную залу з вялікімі сумкамі не дапускаецца.

5.8. Наведванне тэатра з жывёламі забаронена.

5.9. Уваход у глядзельную залу з прадуктамі харчавання і напоямі катэгарычна забаронены.

5.10. Пры ўваходзе ў глядзельную залу сродкі мабільнай сувязі і іншыя электронныя прылады гледача мусяць быць выключаныя.

5.11. Пра пачатак мерапрыемства і неабходнасць заняць сваё месца гледачам паведамляюць тры званкі. Уваход у глядзельную залу адкрываецца пасля першага званка.

5.12. Пасля трэцяга званка ўваход у глядзельную залу не дапускаецца. У якасці выключэння пры спазненні глядач можа ўвайсці ў глядзельную залу толькі з дазволу дзяжурнага адміністратара пры наяўнасці вольных месцаў у зале і толькі ў суправаджэнні кантралёра квіткоў. Пры гэтым дадзены глядач не можа прэтэндаваць на месца, указанае ў квітку, а павінен заняць месца, паказанае яму кантралёрам квіткоў. У сувязі з камернасцю і іншымі асаблівасцямі глядзельнай залы тэатра перамяшчэнне гледача пасля трэцяга званка перашкаджае іншым гледачам і ўдзельнікам спектакля. Месца, указанае ў квітку, дадзены глядач можа заняць толькі падчас антракту.

5.13. У мэтах забеспячэння аховы аўтарскіх і іншых сумежных правоў фота-, відэа-, тэлездымка, любыя віды аўдыёзапіса спектакляў ці іх фрагментаў без спецыяльнага дазволу адміністрацыі тэатра забаронены.

5.14. Падчас правядзення мерапрыемства забараняюцца перамяшчэнні па глядзельнай зале, за выключэннем надзвычайных прычын санітарнага або медыцынскага характару, або звязаных з эвакуацыяй гледачоў.

5.15. Глядач абавязаны не дапускаць непаважлівае стаўленне да адміністрацыі тэатра і абслуговага персаналу, парушэнне агульнапрынятых правілаў і нормаў паводзін (нецэнзурная лаянка, агрэсіўныя паводзіны, парушэнне цішыні ў зале, выкарыстанне прадметаў, якія ствараюць шумавы эфект і замінаюць гледачам).

5.16. Катэгарычна забараняецца заходзіць на сцэну, у тэхнічныя і службовыя памяшканні.

5.17. Падчас пандэміі ўсе гледачы павінны знаходзіцца ў памяшканні тэатра ў ахоўных масках.

5.18. Гледачы, якія не выконваюць законныя ўказанні адміністрацыі тэатра і абслуговага персаналу, якія парушаюць правілы і нормы паводзін могуць быць выдаленыя з тэатра, пры гэтым кошт паслуг (квіткоў) не кампенсуецца і не вяртаецца.

## 6. Гардэроб

6.1. Гардэроб тэатра працуе з кастрычніка па красавік.

6.2. Гардэроб адкрываецца за адну гадзіну да пачатку мерапрыемства.

6.3. У гардэроб тэатра прымаюцца верхняя вопратка і галаўныя ўборы гледачоў з выдачай нумарка.

6.4. Ручная паклажа (заплечнікі, парасоны, буйнагабарытныя сумкі, пакеты і прадметы), за выключэннем дробных асабістых рэчаў, партфеляў і жаночых сумачак, здаюцца ў гардэроб тэатра.

6.5. За згублены або сапсаваны нумарок з гардэроба глядач нясе адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6.6. За пакінутыя ў гардэробе каштоўныя рэчы (кашалькі, тэлефоны, планшэты, ноўтбукі і г.д.) адміністрацыя адказнасці не нясе.

## 7. Бюро знаходак

7.1. Любыя асабістыя рэчы, знойдзеныя ў памяшканнях тэатра, павінны быць дастаўлены ў кабінет прадстаўнікоў службы гледача. У выпадку страты рэчаў неабходна звярнуцца да адміністратара або старэйшага кантралёра квіткоў.

## 8. Бяспека

8.1. Пры наведванні мерапрыемства грамадзяне абавязаны захоўваць грамадскі парадак і выконваць усе законныя патрабаванні адміністрацыі тэатра. У мэтах захавання грамадскага парадку падчас наведвання мерапрыемства гледачам **забараняецца:**

- мець пры сабе халодную, агнястрэльную, газавую ці іншую зброю, выбуховыя рэчывы і боепрыпасы, іх імітатары і муляжы, а таксама спецыяльна выраблены ці прыстасаваныя прадметы, выкарыстанне якіх можа ўяўляць з сябе пагрозу жыццю і здароўю грамадзян або нанесці матэрыяльную шкоду грамадзянам і арганізацыям;
- ствараць пагрозу грамадскай бяспецы, жыццю і здароўю грамадзян;
- знаходзіцца ў стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап'янення.

8.2. Паленне ў будынку тэатра катэгарычна забаронена.

8.3. У выпадку выяўлення ў памяшканнях тэатра прадметаў, пакінутых без нагляду, пра знаходку неабходна неадкладна паведаміць любому

прадстаўніку адміністрацыі. Браць у рукі, адкрываць, ссоўваць з месца выяўленыя прадметы катэгарычна забараняецца.

8.4. За шкоду, нанесеную гледачом, маёмасці тэатра глядач нясе адказнасць, прадугледжаную дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## 9. Праца са сродкамі масавай інфармацыі

9.1. Прадстаўнікі СМІ наведваюць тэатр згодна з Рэгламентам узаемадзеяння тэатра са СМІ, размешчаным на афіцыйным сайце тэатра.

## 10. Замена, адмена і змена загадзя абвешчаных часу (тэрмінаў) або месца правядзення мерапрыемства

10.1. Адміністрацыя тэатра пакідае за сабой права на замену, адмену мерапрыемства, замену раней абвешчанага часу і / або месца правядзення мерапрыемства. Ва ўсіх вышэйпералічаных выпадках парадак выплаты грашовых сродкаў за ўваходны квіток вызначае тэатр.

10.2. У выпадку змены загадзя абвешчаных часу (тэрмінаў) або месца правядзення мерапрыемства, замены яго іншым мерапрыемствам глядач мае права наведаць гэтае мерапрыемства на падставе наяўнага ўваходнага квітка ў адпаведнасці з новымі тэрмінамі яго правядзення.

10.3. Адміністрацыя тэатра мае права адмовіцца ад правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства.

10.4. Адміністрацыя тэатра пакідае за сабой права ўносіць змены ў акцёрскі склад спектакляў тэатра без папярэдняга паведамлення. Змены ў акцёрскім складзе не з'яўляюцца падставай для вяртання квітка.

## 11. Наведванне тэатра на дабрачыннай аснове

11.1 Наведванне тэатра на дабрачыннай аснове ажыццяўляецца па папярэднім пісьмовым узгадненні з адміністрацыяй тэатра. Размяшчэнне ў зале гледачоў, унесеных у спіс, ажыццяўляецца на вольныя месцы (пры іх наяўнасці). Адказнасць за дадзенае наведванне ўскладаецца на работніка арганізацыі, якая ініцыявала наведванне мерапрыемства.

З усімі пытаннямі і пажаданнямі, якія паўсталі падчас наведвання тэатра, неабходна звяртацца да дзяжурнага адміністратара.